# ВЫСТАЎКІ ТВОРАЎ ГОРКАГА

Буйнейшыя бібліятэкі Менска арганізавалі выстаўкі, якія адлюстроўваюць жыццёвы і творчы шлях вялікага пролетарскага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага.

На выстаўцы ў бібліятэцы імя Леніна паказаны рэдкія выданні твораў Горкага, а таксама выданні апошніх год. Выстаўка багата ілюстравана малюнкамі і фотаздымкамі са старых журналаў, у якіх друкаваліся апавяданні і аповесці Горкага.

У бібліятэцы Акадэміі навук БССР выстаўлены першыя выданні твораў Горкага 1890—1901 гг., а таксама тагочасны зборнік крытычных артыкулаў аб творчасці пісьменніка. На выстаўцы ёсць матэрыял на тэму: «Сучасны Захад аб Горкім» і «Ленін і Сталін аб Горкім».

Такія-ж выстаўкі арганізаваны ў бібліятэцы Дома партактыва і ў бібліятэцы імя Пушкіна. (БЕЛТА).